Сяргей Запрудскі

Беларуская мова ў яе кантактах з расійскай: у ціскách аднімальнага білінгвізму

1. У коле славянскіх моў беларуская мова займае вельмі спецыфічнае, зусім не падобнае да іншых, становішча. Калі зыходзіць з колькасці носьбітаў беларускай мовы,[1] то яе, верагодна, можна характарызаваць як „сярэднюю“ па велічыні славянскую мову. Згодна з дадзенымі перапісу насельніцтва 1999 года, беларусы налічваюць у Рэспубліцы Беларусь 8 млн. 159 тыс. чалавек, складаючы пры гэтым 81,2 % насельніцтва краіны. Падчас перапісу 6 млн. 987 тыс. беларусаў назвалі сваёй роднай беларускую мову, а 3 млн. 373 тыс. сцвердзілі, што дома звычайна размаўляюць па-беларуску (Национальный состав 2001, 16, 38, 199, 303). Натуральна, у Беларусі беларускую мову лічаць роднай таксама і некаторыя небеларусы, гэтаксама не толькі беларусы гавораць дома па-беларуску, аднак нават прыведзеныя лічбы дазваляюць меркаваць, што колькасць носьбітаў беларускай мовы значна перавышае колькасць носьбітаў такіх моў як лужыцкія, славенская, македонская. Калі ж кіравацца крытэрыем карыстальнікаў беларускай мовай, то іх колькасць, відаць, перавысіць яшчэ як мінімум колькасць карыстальнікаў такімі славянскімі мовамі, як харвацкая і славацкая.[2]

Нягледзячы на даволі значны (у параўнанні з некаторымі іншымі славянскімі мовамі) дэмаграфічны патэнцыял беларускай мовы многія іншыя паказчыкі яе бытавання выглядаюць зусім не аптымістычна. У Беларусі існуюць многія важныя сферы камунікацыі, у якіх беларуская мова або не ўжываецца ўвогуле, або ўжываецца ў нязначнай ступені. Да іх ліку належаць сферы дакладных навук, вышэйшай адукацыі, войска, судаводства, буйнога бізнесу, заканадаўства і інш. Па сваёй камунікатыўнай сіле ў многіх ключавых сферах беларуская мова ў Беларусі, несумненна, саступае расійскай мове. Сярод іншых моў найбольшае значэн-

---

[1] Некаторыя аўтары адрозніваюць, з аднаго боку, носьбітаў пэўнай мовы і, з другога, карыстальнікаў ёю (Нещименко 1998). Падобнае размежаванне нам здаецца абгрунтаваным, і мы будзем ім карыстацца пры кваліфікацыі беларускай сітуацыі.

[2] Пытанне колькасці носьбітаў беларускай мовы амаль заўсёды вызначаюць зыходзячы з дадзеных перапісаў насельніцтва. Так, у адным з апошніх даведнікаў савецкага часу колькасць беларускамоўных у СССР са спасылкай на матэрыялы перапісу 1979 г. была акрэслена як „звыш 8 млн. чалавек“ (Судник 1990). У энцыклапедыі „Беларуская мова“ 1994 г. гаворыцца аб беларусах, якія сваёй роднай лічаць беларускую мову (6 млн. 498 тыс.), і пра жыхароў Беларусі, што назвалі беларускую мову другой (1 млн. 215 тыс.) (Лукашанец 1994). Несумненна, ёсць выразная загана ў вызначэнні носьбітаў якойнебудзь мовы зыходзячы адзіна з матэрыялаў перапісаў насельніцтва, на што неаднойчы звярталася ўвага (параўн., напрыклад: Woolhiser 1995, 69, 74; Bieder 2001, 462). З гэтай прычыны недасканалымі з’яўляюцца таксама лічбы, якімі карыстаемся мы. Варта, аднак, адзначыць, што праведзеныя на абмежаваным матэрыяле сацыялінгвістычныя даследаванні часам могуць дэзарыентаваць значна больш, чым дадзеныя любога перапісу. Параўн. у гэтым плане меркаванне расійскай даследчыцы В. Міхальчанкі, згодна з якім у Беларусі „большинство населения своим родным языком считают именно русский“ (цыт. паводле: Коряков 2002, 111).

не ў Беларусі маюць польская, украінская, яўрэйская, а таксама некаторыя замежныя, найперш англійская і нямецкая.

2. Гісторыя суадносінаў паміж беларускай і расійскай мовамі распадаецца на два перыяды: старажытны (XIV–XVIII стст.) і новы (XIX–XX стст.). Гэтыя перыяды выразна адрозніваюцца не толькі працягласцю кантактаў, але і іх скіраванасцю. Калі ў старажытны перыяд пераважаў уплыў беларускай мовы на расійскую, то ў новы час узаемадзеянне набыло адваротны напрамак. У якасці мовы, што шырока абапіралася на народныя крыніцы і ў меншай ступені залежала ад іншых моў, старабеларуская літаратурная мова аформілася намнога раней за расійскую літаратурную мову, для якой аж да XVIII ст. зусім актуальнай была патрэба калі не разрыву з царкоўнаславянскім складнікам, то, прынамсі, яго значнага абмежавання. У Вялікім княстве Літоўскім беларуская мова была афіцыйнай і нават выкарыстоўвалася ў якасці міжнароднай – напрыклад, у зносінах паміж Кракавам і Масквой. Творы з істотным выкарыстаннем народнай (беларускай) стыхіі бытавалі ў Беларусі не толькі ў рамках канцылярска-юрыдычнага пісьменства, палемічнай і мастацкай літаратуры, але таксама і ў межах рэлігійных жанраў. У 1580 г. Васіль Цяпінскі здзейсніў пераклад на беларускую мову Евангелля. Больш ранняе развіццё цывілізацыі (і, у прыватнасці, кнігадрукавання) на землях Вялікага княства Літоўскага ў параўнанні з Маскоўскім княствам спрыяла таму, што ў XVI–XVIII стст. многія паняцці культуры і цывілізацыі траплялі ў расійскую літаратурную мову праз беларускае пасярэдніцтва.[3] Аднак у другой палове XVII–XVIII стст. старабеларуская пісьмовая мова прыйшла ў заняпад і была выцеснена польскай. Новая беларуская літаратурная мова вельмі павольна зараджалася ў XIX ст. без адчувальнай сувязі з багатай старабеларускай пісьмовай спадчынай.

2.1. У новы час першыя спробы літаратурнай (паэтычнай) творчасці на беларускай мове і першыя прысвечаныя ёй лінгвістычныя працы датуюцца першай паловай XIX ст. Нацыянальная беларуская тоеснасць у XIX ст. узрастала праз адкрыццё прадстаўнікамі беларускай інтэлігенцыі беларускай гісторыі, фальклору і мовы, аднак на гэтым шляху існавалі шматлікія перашкоды.

У XIX ст. беларускія губерні ўяўлялі сабой у значнай ступені забыты Богам кут Расійскай імперыі, куды найноўшыя грамадскія ідэі прабівалі сабе дарогу з вялікімі цяжкасцямі. Беларусь не была ўлучана ў агульнаеўрапейскія працэсы адраджэння і фармавання народаў. На яе тэрыторыі амаль не развівалася вышэйшая адукацыя (Віленскі універсітэт быў зачынены ў 1832 годзе, а заснаваны ў 1848 г. Горы-Горацкі земляробчы інстытут – у 1864 г.)

---

[3] П. Бяссонаў у 1871 г. сцвярджаў, што «литературный язык „белорусский“ [...] вошел весьма влиятельным ингредиентом в литературу великорусскую, теми же путями, даже белорусский говор с его произношением [...] переделал собою, с половины XVII века, центральное наречие московское» (Бессонов 1871, IV–V). Матэрыялы аб уплыве беларускай мовы на расійскую ў сярэднія вякі экспліцытна або імпліцытна прысутнічаюць у працах, прысвечаных уздзеянню на расійскую мову з боку польскай (параўн., напрыклад, Witkowski 1999), або ў працах па расійскай гістарычнай лексікалогіі (параўн. Биржакова, Войнова, Кутина 1972 і, асабліва, шматлікія працы венгерскага славіста А. Золтана, напрыклад: Zoltán 1998).

2.2. Фактарам, які да 80-х гг. XIX ст. істотна запавольваў фармаванне уніфікаванага погляду на беларускую мову і яе распрацоўку, была адсутнасць адзінага лінгвоніма для яе наймення. У літаратуры таго часу беларускую мову называлі „беларускай“, „крывіцкай“, „рускай“, „руськай“, „літоўска-рускай“, „польска-рускай“, „заходнярускай“, „балтыйска-рускай“, „чарнарускай“, „літоўскай“ і інш. Шматлікасць лінгвонімаў з кампанентам „рускі“ поруч з улікам таго факту, што ў пачатку XIX ст. пра беларускую мову лінгвісты пісалі найперш як пра гістарычную пісьмовую мову сярэднявечча, сярод іншага сведчыць аб тым, што найбольш пашыранай гістарычнай назвай беларускай мовы было найменне *руская мова*. У першай палове XIX ст. агульнае для ўсіх трох усходнеславянскіх моў старое найменне *руская мова* (*язык*) было прыпісана адной з іх з выдзяленнем з яго храналагічна менш глыбокіх і іерархічна ніжэйшых *велико-русского языка, мало-русского языка* і *бело-русского языка*. Адзін з гэтых ідыёмаў – *великорусский* (пазней проста *русский*) *язык* – як „галоўны“ спадкаемца старога *рус(ь)кого языка* заняў асаблівае становішча.[4] Замацаванне ў працэсе расійскай нацыянальнай самаідэнтыфікацыі ў 1810–1830-я гг. лінгвоніма *русский язык* за тагачаснай мовай самага вялікага усходнеславянскага народа[5] (і, адпаведна, немагчымасць яго выкарыстання ў афіцыйным навуковым ужытку ў дачыненні да мовы беларусаў) зацямняла рэтраспектыву беларускай мовы, без якой, відавочна, цяжка было разглядзець і яе перспектыву. З другога боку, страта беларускай мовай яе гістарычнай назвы спрычынілася да запозненага зацверджання за ёю новага ўстойлівага наймення.[6] Засваенне назвы „беларуская мова“ не было хуткім, яно ў асноўным адбылося ў другой палове XIX ст. На павольнае прыняцце лінгвоніма „беларуская мова“, несумненна, уплывала тая акалічнасць, што за ўсімі – як усходне-, так і заходнебеларускімі – землямі (г. зн. тэрыторыямі, на якіх ужывалася беларуская мова) назва *Беларусь* (*Белая Россия, Белоруссия*) канчаткова замацавалася толькі ў другой палове XIX ст.

---

[4] Для таго, каб не блытаць *русский язык* у яго сучасным разуменні са старой *рус(ь)кай мовай* (уласна беларускай пісьмовай мовай сярэднявечча), некаторыя аўтары ў англамоўных і нямецкамоўных працах карыстаюцца для абазначэння гэтых ідыёмаў рознымі лінгвонімамі. Першая мова пры гэтым пазначаецца як *Russian language, russische Sprache*, у той час, як другая – *Ruthenian language, ruthenische Sprache* (Wexler 1992, 44 і наст., Hentschel 1997, 218 і наст.).

[5] Сярод пералічаных С. Булічам у яго „Очерке истории языкознания в России“ 17-ці школьных расійскамоўных граматык расійскай мовы 1810–1825 гг. фіксуюцца 16 граматык „российского языка“ і толькі адна – „русского языка“ (Булич 1904, 1003–1005). Гістарычная нагружанасць тэрміна „русский“ для расійскага нацыянальнага самапазнання падкрэсліваецца і ў некаторых сучасных працах. Параўн., напрыклад, непрыняцце ў кантэксце гаворкі пра адраджэнне расійскага народа А. Трубачовым уласцівай сённяшняму часу „рецессивности словоупотребления *русский* – в пользу *российского*“ (гл.: Трубачев 1995, 35).

[6] Строга кажучы, лінгвонім „беларуская мова“ таксама з’яўляецца гістарычным. Так, „билорускиь језик“, „билоруска бесида“ былі аб’ектам увагі сярод іншых славянскіх моў у вядомай граматыцы 1666 г. Ю. Крыжаніча. Несумненна, аднак, што тэрмін „беларуская мова“ у параўнанні з выразам „руская мова“ – другасны. У 1836 г. Дзм. Языкаў небеспадстаўна пісаў пра лінгвонім „белорусский язык“ як пра „недавний“ (Перавалава 1998, 92).

2.3. Сітуацыю беларускага самапазнання ў XIX ст. надзвычайна ўскладняла тая акалічнасць, што ў гэты час Беларусь была арэнай востpай палітычнай і культурнай барацьбы паміж двума моцнымі суседнімі славянскімі народамі, польскім і расійскім, пры гэтым многія беларускія культурныя дзеячы так ці іначай былі ўцягнуты ў гэта змаганне. Пасля ўключэння Беларусі ў склад Расіі прадстаўнікам польскай навукі было важным сцвердзіць, што далучаныя да Расіі беларускія землі маюць у сваёй аснове нерасійскі характар. Для расійскай партыі са свайго боку істотным было давесці спрадвечна расійскі характар беларускіх тэрыторый. Самастойны беларускі рух зарадзіўся акурат на перасячэнні польска-расійскай барацьбы, напачатку пераважна як складовая частка польскага руху (Radzik 2000). З цягам часу беларускі напрамак рабіўся ўсё больш самастойным, паступова ўцягваючы ў сваю арбіту не толькі дзеячоў польскай культурна-палітычнай плыні, але і прадстаўнікоў прарасійскай арыентацыі. Рознае (польскае і расійскае) культурнае паходжанне беларускіх дзеячоў XIX–пачатку XX стст. пакінула моцны след на ўсёй беларускай культуры гэтага часу і, у прыватнасці, абумовіла выкарыстанне ў беларускай мове дзвюх графік, лацінскай і кірылічнай.[7]

Калі ў першай палове XIX ст. расійскія навукоўцы нярэдка разглядалі беларускую мову як нешта дзіўнае, арыгінальнае і ў кожным разе малавядомае,[8] то ў другой палове XIX ст. у расійскай навуцы аформілася думка, згодна з якой беларуская мова безумоўна кваліфікавалася як складовая частка расійскай мовы („русского языка“). Беларуская мова не прызнавалася за самастойную нягледзячы на тое, што колькасць напісаных на ёй твораў у XIX ст. няспынна павялічвалася, насуперак таму, што ў многіх лінгвістычных працах другой паловы XIX ст. яе арыгінальны характар быў дэталёва паказаны.[9] Гэта сталася нягледзячы на тое, што з 1890-х гг. у Расіі сталі з’яўляцца творы расійскіх аўтараў у перакладзе на беларускую мову. У сітуацыі ўмацавання расійскай дзяржаўнасці, інтэнсіўнага фармавання расійскай нацыянальнай ідэалогіі і ўсё большага ўцягнення Беларусі ў сферу расійскіх інтарэсаў практыка непрызнання самастойнасці беларускай мовы адлюстроўвала дзейснасць старога прынцыпа: *чыя дзяржава, таго і мова*.[10]

---

[7] Пра акалічнасці і наступствы выкарыстання ў беларускай мове двух алфавітаў гл.: Мечковская 1998.

[8] У гэты час некаторыя расійскія і расійска-арыентаваныя аўтары былі нават схільны да рамантычнага ўзвышэння беларускай мовы. Напрыклад, К. Калайдовіч лічыў беларускую мову „чистой славянской“, думаў, што ў ёй захаваліся „драгоценные остатки древнего языка славянского“ (Прыгодзіч 1994, 22, 23). Дзм. Языкаў меркаваў, што беларускую мову можна называць „отцом великороссийского наречия“ (Перавалава 1998, 93). П. Шпілеўскі атаясамліваў беларускую (або крывіцкую) мову з агульнаславянскай, г. зн. праславянскай (Шпилевский 1992, 99).

[9] Заслуга ўсебаковага апісання беларускай мовы ў канцы XIX / пачатку XX стст. належыць Я. Карскаму. На працягу 1885–1896 гг. у Маскве і Варшаве ён апублікаваў некалькі грунтоўных прац па беларускай мове, а ў 1893 і 1896 гг. абараніў (у Кіеве і Маскве) магістарскую і доктарскую дысертацыі па беларусістыцы. Вяршыняй яго навуковай дзейнасці стала шматтомная публікацыя „Белорусы“ (1903–1922), якая фактычна не мае аналагаў у славістыцы (McMillin 1967, 210).

[10] Для расійскай дзяржавы ў XIX ст. на заходнім (славянскім) напрамку прыярытэтным было высвятленне адносінаў з іншым славянскім народам – польскім. У пачатку 1860-х гг., не жадаючы пакінуць Беларусь польскім краем, расійскі ўрад зрабіў некаторыя мінімальныя крокі для стварэння магчымасці самастойнага культурнага развіцця Бела-

3. Дзяржаўная палітыка ў дачыненні да беларускай мовы выкрышталізавалася ў Расіі не адразу. Спачатку існавала патрэба вызначыць, што ж такое беларуская мова ўвогуле, у якіх адносінах яна знаходзіцца да расійскай, польскай, украінскай і г. д. Доўгі час гэтаму замінаў адносна невысокі ўзровень параўнальна-гістарычнай лінгвістыкі і славяназнаўства ў тагачаснай Расіі. Калі, напрыклад, у 1850-я гг. паўстала пытанне аб публікацыі песняў з г. зв. „Белорусского архива“ П. Кірэеўскага, якая павінна была суправаджацца пераводам запісаў з лацінскай на кірылічную графіку, то, паводле П. Бяссонава, „тогдашнее наше общество с его наукою на такой труд по меньшей мере насмеялось бы“ (Бессонов 1871, XI).

Сітуацыя стала рэзка мяняцца пасля паўстання 1863 г. У гэты час у значнай ступені як вынік расійска-польскага процістаяння значна актывізавалася навуковае даследаванне Беларусі. Акрамя таго, урад распрацаваў цэлую сістэму мераў, скіраваных на „абрусенне Паўночна-Заходняга краю“ і на ўсталяванне ў ім „рускага элемента“. Яшчэ раней быў прыняты ўказ аб забароне друкаваць кнігі лацінскімі літарамі – і ва ўмовах Беларусі гэта азначала прыпыненне друкавання кніг на беларускай мове ўвогуле, паколькі дагэтуль галоўным шрыфтам беларускай мовы быў лацінскі. У канцы XIX ст. у Расіі беларускія культурныя ініцыятывы існавалі толькі як нешта незаконнае. Калі гэта была школа з выкарыстаннем беларускай мовы, то яна магла быць толькі „тайнай“, за ўтрыманне якой належаў штраф да 300 рублёў або турэмнае зняволенне на 3 месяцы (Снапкоўская 1998, 48). Выданне кніг на беларускай мове на тэрыторыі Расіі было немагчымае, таму яны друкаваліся за яе межамі – у Кракаве, Познані, Тыльзіце, Жэневе.

Калі на асноўную частку сялянства ва ўмовах адсталай гаспадаркі і няшчыльнасці грамадскай камунікацыі палітыка непрызнання беларускай мовы ўздзейнічала спачатку пераважна сімвалічна, то ў дачыненні да вышэйшых слаёў беларускага грамадства яна была вельмі эфектыўнай. Мала таго, што ў цэлым у Беларусі ў другой палове XIX ст. палякі і расійцы складалі непрапарцыянальна высокую долю сярод памешчыкаў і чыноўнікаў, дык яшчэ новыя прадстаўнікі чыноўніцтва і інтэлігенцыі, якія рэкрутаваліся з ліку беларусаў, для здабыцця сацыяльнага поспеху абавязкова павінны былі авалодваць расійскай мовай. Гэта яны маглі рабіць больш паспяхова пры ўмове адначасовага пазбаўлення ад таго, што іх звязвала з нізкім (і беларускамоўным) мінулым. Найбольш заўважнай рысай ніжэйшасці ў асяроддзі сярэдніх і вышэйшых класаў была беларуская мова.[11] *Мовай хлеба* ў гэты час у беларускім грамадстве магла быць толькі расійская, і паступова такая сітуацыя ўзгадавала ў значных слаях грамадства пагарду да роднай мовы. Беларуская мова была ў гэты час *мовай сэрца* для нязначнай колькасці людзей, бо яшчэ не была выбудавана беларуская нацыянальная ідэалогія. На па-

---

русі, у прыватнасці, санкцыянаваў публікацыю некалькіх брашур на беларускай мове. Акрамя таго, разглядалася пытанне аб выданні беларускамоўнай газеты. Аднак „польскае“ паўстанне 1863 г., у якім удзельнічалі многія беларускія дзеячы, паставіла на парадак дня ў Беларусі рашучую барацьбу з польскім элементам, тым самым зрабіўшы праблему пэўнай саступкі беларускаму руху неактуальнай.

11 „Адазвацца па-беларуску азначала тое самае, што голым паказацца на вуліцы“, – успамінаў рэдактар-выдавец „Нашай нівы“ А. Уласаў (Каўко 1987, 19). Гэта, вядома, не падразумявала, што публічна ніхто не мог гаварыць і не гаварыў па-беларуску. Публічнае маўленне на беларускай мове было незвычайным з вуснаў прадстаўнікоў вышэйшых станаў.

чатку 1880-х гг. беларускія студэнты Пецярбурга сфармулявалі (на расійскай мове) некаторыя важныя пастулаты беларускай нацыянальнай ідэалогіі. У прыватнасці, яны сцвердзілі, што „Белоруссия имеет свой особенный язык, который, по мнению опытных филологов, представляет много интересного, как остатки наиболее сохранившегося чистого славянского наречия...“ (Радзік 2001). У 1891 г. у прадмове да выдадзенага ў Кракаве зборніка вершаў „Дудка беларуская“ Ф. Багушэвіч першы загаварыў з чытачом „аб нашай долі-нядолі, аб нашай бацькавай спрадвечнай мове, каторую мы самі, да і не адны мы, а ўсе людзі цёмныя „мужыцкай“ завуць, а завецца яна „беларускай“. Паэт заклікаў сваіх чытачоў не пакідаць „мовы нашай беларускай, каб не ўмёрлі!“ Аднак гэта былі толькі парасткі нацыянальнай ідэалогіі. Лепшыя часы наступілі падчас рэвалюцыйных падзей у Расіі ў 1905–1907 гг., калі сярод іншага была скасавана забарона на публікацыі на беларускай мове. У 1906 г. у Вільні ўзніклі дзве газеты на беларускай мове, „Наша доля“ і „Наша ніва“. Другая з іх выдавалася да 1915 г. і мела выключнае значэнне для развіцця беларускай самасвядомасці. К гэтаму часу, аднак, ужо трывала выпрацаваліся сацыяльныя канатацыі назваў „беларус“, „беларуская мова“. На пераломе XIX–XX стст. слова *беларус* фактычна атаясамлівалася з словам *селянін*, у афіцыйных актах Дзяржаўнай Думы Расіі фігуравала гібрыдная катэгорыя „крестьян-белорусов“ або „белорусов-крестьян“ (Запруднік 2001, 122). Беларускі нацыянальны рух пачатку XX ст. быў моцна прасякнуты сацыяльным зместам.[12]

3.1. Новым і вельмі важным перыядам у беларускім моўным развіцці сталі гады першай сусветнай вайны і рэвалюцыйны 1917 г. у Расіі. У 1915 г. на тэрыторыі акупаванай немцамі Заходняй Беларусі ўпершыню было прызнана раўнапраўе беларускай мовы поруч з польскай, літоўскай і іншымі мовамі краю. У выніку ў Заходняй Беларусі стала інтэнсіўна пашырацца беларускае школьніцтва (Рудовіч 2001). У сакавіку 1918 г. была абвешчана Беларуская Народная Рэспубліка, якая ў адным са сваіх першых актаў дэкларавала на сваёй тэрыторыі афіцыйны статус беларускай мовы. Нягледзячы на пачатковае нежаданне бальшавіцкай улады прызнаваць этнаграфічныя асаблівасці Беларусі,[13] у 1920-я гг. афіцыйны статус беларускай мовы пацвярджаўся ў розных дзяржаўных актах Беларускай Савецкай Сацыялістычнай Рэспублікі, у тым ліку ў канстытуцыі БССР 1927 г. Юрыдычна і ў значнай ступені фактычна ў другой палове 1920-х гг. у Беларусі былі 4 афіцыйныя мовы – беларуская, яўрэйская, расійская, польская, але беларуская пры гэтым кваліфікавалася як „пераважная“.

---

[12] У тым, што беларускі рух з канца XIX ст. быў моцна звязаны з сацыялістычнымі ідэямі, варта бачыць у тым ліку наступства той акалічнасці, што беларускія (*resp.* аўтанамісцкія) настроі не знаходзілі ніякага спачування сярод расійскіх ліберальў. Найбольш прагрэсіўным расійскім чыноўнікам і ліберальным крытыкам аўтакратыі быў, паводле А. Рыбэра, уласцівы „моцны імперскі імпульс“. Гэты ж аўтар зазначае, што „за выняткам крайне левых, пачынаючы з Чарнышэўскага, у расійскіх інтэлектуалаў і палітычных лідэраў не было антыімперскіх сантыментаў...“ (Rieber 1994, 334).

[13] У 1918 г. сакратар ЦК КП(б) Літвы і Беларусі В. Кнорын выказаў меркаванне, што „белорусы не являются нацией и те этнографические особенности, которые их отделяют от остальных русских, должны быть изжиты“ (Кнорин 1990, 33).

У 1924–1933 гг. у Беларусі праводзілася палітыка г. зв. „беларусізацыі“, важнай складовай часткай якой было пашырэнне ўжывання беларускай мовы ў розных сферах грамадскага і дзяржаўнага жыцця. Стратэгічнай мэтай беларусізацыі было замацаванне праз „змычку рабочага класа і сялянства“ (першы пры гэтым быў пераважна расійскамоўным, а другое – беларускамоўным) савецкай улады, г. зн. пашырэнне беларускай мовы разглядалася толькі як інструмент у здзяйсненні іншых, палітычных мэтаў. Аднак пэўная паслядоўнасць у правядзенні гэтай палітыкі, а таксама значны водгук на яе ў шырокіх слаях насельніцтва далі вельмі значныя вынікі як у сферы ўнутранай разбудовы беларускай мовы, так і ў сферы планавання яе статусу. Так, на працягу 1920-х гг. умацавалася правапісная і граматычная сістэма беларускай мовы, упершыню выкладзеная з навучальнымі мэтамі ў 1918 г. у „Беларускай граматыцы для школ“ Б. Тарашкевіча. У гэты час значна павялічыўся лексічны склад беларускай літаратурнай мовы, кадыфікаваны ў шэрагу слоўнікаў. У 1920-я гг. у Інстытуце беларускай культуры актыўна выпрацоўвалася навуковая тэрміналогія, у выніку чаго ў пачатку 1930-х гг. на беларускай мове ўжо выдавалася даволі разнастайная літаратура, у тым ліку па аўтамабільнай і слясарнай справе, электратэхніцы, машынабудаванні, хірургіі, гінекалогіі, крыміналістыцы і інш. Разбудова беларускай мовы ў 1920-я гг. грунтавалася на ўліку ўнутраных фактараў развіцця беларускай мовы і абапіралася на расійскую мову і практыку расійскага моўнага будаўніцтва толькі ў выпадку неабходнасці.

Палітыка беларусізацыі была вельмі эфектыўнай і з пункту гледжання пашырэння сфераў ужывання беларускай мовы – асабліва ў галіне школьнага навучання, кнігавыдання, у сістэме дзяржаўнага кіравання. У 1932 г. беларускамоўныя школы складалі ўжо 90 % ад агульнай колькасці школ, тады як польскамоўных было 3,6 %, яўрэйскамоўных 3,2 %, расійскамоўных 1 %. Акрамя таго, у 1932 г. у Беларусі працавала таксама пэўная колькасць украінскамоўных, латышскамоўных, літоўскамоўных, нямецкамоўных і эстонскамоўных школ (Андрэева 1989, 6–7). Калі ў 1924 г. у Беларусі на беларускай мове выдавалася 43,9 % кніг і брашур, то ў 1925-м іх было ўжо 68,5 %, а ў 1930-м 94,3 % (Войніч 1990, 43). У 1920-я гг. у БССР пашырэнне беларускай мовы разглядалася ў тым ліку як кампенсацыйная мера за стрымліванне яе развіцця ў папярэднія гады. Паколькі ў Расійскай імперыі неспрыяльным фактарам развіцця беларускай мовы была расійская мова, то ў 1920-я гг. у БССР яе развіццём на дзяржаўным узроўні амаль не займаліся.

3.2. Сітуацыя рэзка змянілася з пачатку 1930-х гг. У сувязі з агульнай зменай партыйна-дзяржаўнай палітыкі і стаўлення да сялянства, у прыватнасці („ліквідацыя кулацтва як класа“), ранейшая практыка пратэжыравання (сялянскай) беларускай мовы была прызнана варожай і шкодніцкай, а ўсе дзеячы, якія займаліся яе правядзеннем, былі рэпрэсаваны. Аднак па інерцыі ў 30-я гг. беларуская мова яшчэ захоўвала пануючае становішча ў сістэме сярэдняй адукацыі.

Пад зачэпкай таго, што ў Савецкім Саюзе з’явілася вялікая колькасць ворагаў, якія праводзілі палітыку „изоляции молодежи от русской культуры“ („Правда“, 20 марта 1938 г.), у сакавіку 1938 г. СНК СССР і ЦК ВКП(б) прынялі пастанову „Аб абавязковым вывучэнні расійскай мовы ў школах нацыянальных рэспублік і абласцей“. Гэты дэкрэт з’явіўся рэвізіяй ранейшых падыходаў, якія абвяшчалі непрымусовасць у вывучэнні расійскай мовы. Ужо праз месяц пасля прыняцця гэтай

пастановы ў некаторых мінскіх школах перасталі выкладаць беларускую мову („Советская Белоруссия“, 27 апреля 1938 г.). У ліпені 1938 г. на сесіі Вярхоўнага Савета БССР расійская мова была зацверджана ў якасці другой дзяржаўнай у Беларусі,[14] аднак паколькі гэты акт адбыўся ва ўмовах жудасных парушэнняў законнасці, то пазней на яго ніколі не спасылаліся.

Пасля другой сусветнай вайны неспрыяльным фактарам развіцця беларускай мовы было тое, што кіруючыя пасады ў дзяржаўна-партыйнай эліце Беларусі ў значнай ступені займалі прысланыя з Расіі чыноўнікі. Дзейнасць, скіраваная на развіццё беларускай мовы, разглядалася імі як несугучная з генеральнай лініяй партыі. Калі ў 1947 г. загадчык кафедры педагогікі аднаго з правінцыйных педінстытутаў выказаў крытычныя заўвагі ў сувязі з тым, што „беларуская мова падлягае забыццю“, то бюро ЦК КПБ у спецыяльнай пастанове асудзіла яго ўчынак (Навіцкі 1993, 99). Абцяжарвальным момантам для развіцця беларускай мовы ў першыя пасляваенныя гады было і тое, што ў гэты час была яшчэ свежай памяць пра дзейнасць акупацыйнай улады, якая ў 1941–1944 гг. з апорай на беларускіх калабарантаў нямала зрабіла для ўмацавання становішча беларускай мовы. У канцы 1950-х гадоў пазіцыі беларускай мовы былі моцна падарваны ў сувязі з правядзеннем у СССР адукацыйнай рэформы. Прыняты ў 1959 г. Вярхоўным Саветам БССР Закон аб адукацыі ўстанавіў правіла, паводле якога вывучэнне беларускай мовы ў школах з расійскай мовай навучання мела праводзіцца „згодна з жаданнем вучняў і іх бацькоў“. У выніку ў 1960–1970-я гг. у Беларусі незвычайнае пашырэнне набыла практыка вызвалення вучняў ад вывучэння беларускай мовы. Так, у 1969 г. у БССР беларускую мову не вывучалі 30 % школьнікаў, а ў Мінску 90 %.

У 1960–1970-я гады Беларусь зведала вельмі высокія тэмпы урбанізацыі. Калі ў 1959 г. гарадскія жыхары Беларусі складалі 31 % усяго насельніцтва, то ў 1970-м іх было ўжо 43 %, у 1979-м 55 %, у 1985-м 62 %. Вельмі высокая доля новых гараджан паходзіла з беларускамоўнай вёскі. Аднак гарадское асяроддзе не было прыстасавана для задавальнення моўных патрэб беларускамоўных людзей, таму з пераездам з вёскі ў горад у мігрантаў адбывалася змена мовы. Масавая урбанізацыя (а г. зн. адначасова палепшанне ўмоў жыцця вялікай колькасці людзей) 1960–1980-х гг., якая была цесна звязана з адыходам ад „бескарыснай“ у гарадскіх абставінах беларускай мовы, узгадавала ў многіх пагардлівае стаўленне да яе. Вялікі ўклад у гэтыя працэсы ўнесла і тагачасная ідэалогія, якая абвяшчала хуткі прыход камунізму, стварэнне адзінага „савецкага народа“, прапагандавала тэорыю „другой роднай мовы“ і г. д.

На працягу ўсіх пасляваенных гадоў аж да канца 1980-х у Беларусі і Савецкім Саюзе не прымалася ніякіх юрыдычных захадаў для падтрымкі беларускай мовы, затое рэгулярна зацвярджаліся пастановы, скіраваныя на замацаванне пазіцый расійскай мовы. Інфармацыя пра скіраваныя на падтрымку расійскай мовы дэкрэты пры гэтым шырока не распаўсюджвалася. Для дасягнення канчатковай схаванай мэты савецкага грамадства – асіміляцыі ці прыняцця расійскай мовы як другой роднай – былі распрацаваны вытанчаныя метады (sophisticated strategies) (Haarmann 1998, 79). У 1978 г. была прынята пастанова Савета Міністраў СССР аб

[14] Пра тое, што ў 1920-я гг. у Беларусі былі афіцыйнымі яшчэ яўрэйская і польская, у канцы 1930-х згадвалі толькі з асуджэннем.

увядзенні расійскай мовы ў першыя класы нацыянальных школ СССР. У 1979-м Міністэрства адукацыі СССР рэкамендавала ўвесці выкладанне расійскай мовы ў нацыянальныя дзіцячыя садкі з 5-гадовага ўзросту. У траўні 1983 г. ЦК КПСС і Савет Міністраў СССР прынялі пастанову „Аб дадатковых мерах па паляпшэнні вывучэння расійскай мовы ў агульнаадукацыйных школах і іншых навучальных установах саюзных рэспублік". У зацверджанай на XXII з'ездзе КПСС у 1961 г. трэцяй праграме КПСС быў станоўча ацэнены „происходящий в жизни процесс добровольного изучения, наряду с родным языком, русского".[15]

3.3. У пачатку 1990-х гг. у Беларусі, як і ў іншых рэспубліках былога СССР, праводзілася моўная рэформа. У студзені 1990 г. быў прыняты закон, паводле якога беларуская мова была абвешчана ў Беларусі адзінай дзяржаўнай. Расійская мова ў гэтым законе атрымала статус „мовы міжнацыянальных зносін народаў Саюза ССР". Выкананне Закона аб мовах моцна залежала ад агульнай палітычнай сітуацыі ў Беларусі, і спачатку гэтая сітуацыя была спрыяльнай. Так, на рэалізацыю моўнага заканадаўства ў Беларусі ў самым пачатку 1990-х гг. станоўча ўплывалі абвяшчэнне ў 1991 г. незалежнай Рэспублікі Беларусь, часовае прыпыненне дзейнасці КПСС–КПБ, абранне старшынём Вярхоўнага Савета С. Шушкевіча, а таксама прыняцце Закона аб культуры і Закона аб адукацыі, якія пацвярджалі або нават трохі ўмацоўвалі некаторыя зафіксаваныя ў Законе аб мовах нормы. Аднак з 1992 г. і, асабліва, з 1993 г. як левыя, так і ў значнай ступені правыя палітычныя сілы сталі выступаць за рэвізію заканадаўства 1990 г. Падчас газетнай палемікі першай паловы 90-х гг. у поўнай меры далі сябе адчуць узгадаваныя ў ранейшыя часы негатыўныя стэрэатыпы ў дачыненні да беларускай мовы. Так, у некаторых публікацыях яна кваліфікавалася як „мова письменников", „доморощенный, неповсеместный диалект", „русский диалект польского языка", „диалект русского языка". Рэалізацыя моўнага закона праходзіла ва ўмовах рэзкага пагаршэння ўзроўню жыцця насельніцтва, што адмоўна ўплывала на яго ўспрыманне людзьмі.

У 1994 г. першым прэзідэнтам Рэспублікі Беларусь стаў лідэр харызматычнага тыпу Аляксандр Лукашэнка, які таксама адстойваў неабходнасць надання расійскай мове дзяржаўнага статусу. У 1995 г. з яго ініцыятывы ў Беларусі быў праведзены рэферэндум з чатырох пытанняў, першае выглядала наступным чынам: „Ці згодны Вы з наданнем расійскай мове роўнага статусу з беларускай?" У рэферэндуме прынялі ўдзел 65 % грамадзян, што маюць права ўдзельнічаць у галасаванні, і 83 % з іх, або 54 % ад колькасці ўсіх выбаршчыкаў, выказалі сваю падтрымку моўнаму пункту рэферэндума. Пасля правядзення рэферэндума палітыка, скіраваная на пашырэнне ў Беларусі сфераў ужывання беларускай мовы, была згорнута. З 1995 г. набор дзяцей у беларускамоўныя або расійскамоўныя школы ў гарадской мясцовасці праводзіцца ў значнай ступені з улікам пажаданняў бацькоў, і гэта прывяло да значнага скарачэння беларускамоўнага навучання.

У чэрвені 1998 г. адбылася рэвізія моўнага заканадаўства. У новым моўным законе дзяржаўнымі прызнаны дзве, беларуская і расійская мовы. Амаль у палове

---

[15] Больш падрабязна пра акалічнасці функцыянавання беларускай мовы ў другой палове XX ст. гл: Сямешка 1998. Агляд знешніх прычын, што ўплывалі на лёс беларускай мовы цягам усёй яе гісторыі, гл.: Plotnikau 2000, Мечковская 1994.

яго артыкулаў беларуская і расійская мовы спалучаюцца размеркавальным злучнікам *або* (артыкулы 3, 9, 12–18, 21, 25, 28–30, 32), амаль гэтак жа шырока ў падобных выпадках у законе выкарыстоўваецца спалучэнне двух злучнікаў: *і* і *або* (артыкулы 7, 8, 10, 11, 19, 20, 22–24, 26, 27, 31). Інтэнсіўнае выкарыстанне ў тэксце закона размеркавальнага злучніка *або* адкрывае шырокую вуліцу выкарыстанню толькі адной з моў, без абавязковага ўжывання другой. У законе 1998 года свядома абрана "палітыка адсутнасці палітыкі", якая вядзе да замацавання моўнага нераўнапраўя і выцяснення слабейшай, у дадзеным выпадку беларускай мовы. Паводле Г. Гаармана, прызнанне ў Беларусі за расійскай мовай афіцыйнага статусу поруч з беларускай пакідае беларусам мінімальныя магчымасці ідэнтыфікавацца са сваёй роднай мовай (Haarmann 1998, 82).[16]

4. Уплыў расійскай мовы на беларускую ў розныя перыяды XIX–XX стст. быў неаднолькава інтэнсіўны. Да той пары, пакуль беларуская мова знаходзілася ў стадыі „народнай“ мовы і толькі нязначна развівалася ў літаратурнай сферы, уздзеянне суседніх польскай і расійскай моў на беларускую можа ацэньвацца як слабае. Разам з тым, уключна да 1920-х гг. у творах беларускай мастацкай літаратуры і публіцыстыкі сустракаліся шматлікія (і часта зусім нематываваныя) русізмы і паланізмы (перадусім, лексічныя і фанетычныя і, радзей, марфалагічныя). Урэшце, аднак, значная колькасць русізмаў і паланізмаў XIX–пачатку XX стст. выйшлі з ужытку, бо польскі і, асабліва, расійскі складнік аказаліся непажаданымі ў працэсе моўнага будаўніцтва 1920-х гг. (Wexler 1974). У гэты час расійская мова выступала пасярэдніцай у працэсе запазычвання беларускай мовай многіх заходнееўрапейскіх слоў. Паколькі ў 1920-я гг. інтэлектуальны пласт беларускай лексікі развіваўся надзвычай імкліва і паколькі расійская лексіка амаль заўсёды выступала ў якасці (станоўчых або адмоўных) „пунктаў суаднясення“, то ўздзеянне расійскай мовы на беларускую аж да канца 1920-х гг. можна было б ацэньваць як значнае. Аднак з прычыны таго, што ў гэты ж час адбывалася не менш інтэнсіўнае фарміраванне беларускай літаратурнай мовы на ўласнай аснове, паколькі беларускі правапіс істотна адрозніваўся ад расійскага,[17] а таксама з прычыны таго, што расійскае ўздзеянне свядома абмяжоўвалася, то існаваў пэўны баланс, які дазваляў беларускай мове развівацца без залішняга ціску на яе з боку расійскай.[18]

---

[16] Пра акалічнасці моўнай палітыкі ў Беларусі ў 1990-я гг. падрабязней гл.: Gutschmidt 2000, Bieder 1995, Bieder 1996, Запрудскі 2002, Запрудський 2003, Падлужны 1997, Коряков 2002. Пра ролю моўнай ідэалогіі, пра сувязь мовы з нацыянальнай свядомасцю ў постсавецкай Беларусі гл.: Woolhiser 2001, Marples 1999, Goujon 1999.

[17] На адрозненне ад расійскай мовы вядучым прынцыпам беларускага правапісу з’яўляецца фанетычны.

[18] У сярэдзіне 1920-х гг. адзін з беларускіх кадыфікатараў сцвярджаў, што „цвёрда запазычаных і пашыраных расійскіх слоў [у беларускай мове] бадай што зусім няма...“ (Лёсік 1925, 141). З аднаго боку, многія беларускія лінгвісты 20-х мелі на ўвазе пагрозу русіфікацыі беларускай мовы. З другога боку, яны, падобна, зусім не баяліся такой перспектывы. Я. Лёсік на Акадэмічнай канферэнцыі 1926 г. прапанаваў не пазначаць на пісьме асіміляцыйнага змякчэння свісцячых (пісаць *снег* замест *сьнег* і пад.), выступаў за ўвядзенне ў беларускую графіку літары *и* (васьмярычнага) і інш. Другі пурыст, В. Ластоўскі прапанаваў скасаваць у беларускім алфавіце літары *ў* і *э* (і, як вынік, пісаць: *ішоу, рекі*)!

Гэты баланс быў парушаны пасля зацверджання ў 1933 г. пастановы Савета народных камісараў „Аб зменах і спрашчэнні беларускага правапісу“. Дэкрэт быў прыняты як альтэрнатыва „няправільнаму“ моўнаму будаўніцтву папярэдняга дзесяцігоддзя і сцвярджаў, што ў практыцы планавання корпусу беларускай мовы 1920-х гг. ствараўся „штучны бар'ер паміж беларускай і рускай мовамі“. Рэформа беларускай мовы часам падаецца ў літаратуры як праява татальнай русіфікацыі (Станкевіч 2002). Найбольш выразнымі прыкметамі русіфікацыі падчас рэфармавання 1933 г. трэба лічыць наступныя пункты:

а) пашырэнне выкарыстання канчатка *-а* (*-я*) у формах роднага склону неадушаўлёных назоўнікаў мужчынскага роду на шкоду канчатку *-у* (*-ю*): *універсітэта* замест *універсытэту*, *правапіса* замест *правапісу*;
б) скасаванне націскных формаў *-ом* (*-ём*), *-ох* (*-ёх*) давальнага і меснага склонаў назоўнікаў мужчынскага і ніякага роду назоўнікаў множнага ліку: *братам* замест *братом*, *на палях* замест *на палёх*;
в) скасаванне формаў загаднага ладу дзеясловаў 2-й асобы множнага ліку з канчаткамі *-эце, -еце*: *бярыце* замест *бярэце*, *нясіце* замест *нясеце*;
г) „увядзенне ў беларускі правапіс“ дзеепрыметнікаў незалежнага стану: *пануючы клас* замест *кляса, якая пануе*;
д) прымяненне марфалагічнага прынцыпу напісання у правапісе спалучэнняў зычных *г, ж, з, х, ш* з наступным суфіксальным *с* у прыметніках: *чэшскі* замест *чэскі*, *парыжскі* замест *парыскі*.

Рэформу 1933 г. варта, аднак, ацэньваць дыферэнцыявана. П. Мэё паказаў, што не ўсе пункты рэформы насілі русіфікацыйны характар (Mayo 1977).[19]

Русіфікацыя беларускай мовы падчас рэфармавання 1933 г. палягала не толькі ў прыняцці канкрэтных зменаў. Для будучага лёсу беларускай мовы не менш істотным за канкрэтныя змены аказаўся спосаб іх рэалізацыі. Рэформа была праведзена ва ўмовах тэрору і з поўным занядбаннем дэмакратычных працэдур, што склаліся ў 1920-я гг. у гэтай сферы. Пастанова СНК сімвалізавала для сучаснікаў неадхільную волю наблізіць беларускую мову да расійскай „любой цаной“.

З 1933 г. у беларускую мову шырокім патокам хлынулі разнастайныя русізмы. У 1937 г. ў Мінску быў выдадзены расійска-беларускі слоўнік пад рэдакцыяй А. Александровіча, у беларускай частцы якога замест уласных слоў вельмі часта

Паводле П. Вэкслера, беларуская літаратурная мова наўрад выжыла б нават у выпадку, калі б не было неспрыяльных зменаў 1930-х гг. На карысць такога меркавання, на думку Вэкслера, сведчаць (занадта) блізкая роднаснасць беларускай і расійскай моў, значны арэал іх геаграфічнага сутыкнення і шырокая ўжывальнасць у Беларусі расійскай мовы (Wexler 1992, 44–46).

[19] У пастанове СНК, аднак, складана адназначна кваліфікаваць блок заменаў, звязаны з правапісам запазычаных слоў (*методыка* замест *мэтодыка*, *аэраплан* замест *аэраплян*, *сістэма* замест *сыстэма*, *арфаграфія* замест *артаграфія*). З аднаго боку, у XIX–XX стст. запазычанні ўваходзілі ў беларускую мову як праз польскае, так і праз расійскае пасярэдніцтва. З другога, беларуская мова ў большасці выпадкаў не мае ўласнага спосабу перадачы запазычанняў. Нягледзячы на тое, што ў выпадку заменаў тыпу *методыка/мэтодыка* і пад. арыентацыя на расійскую арфаграфію была відавочнай, іх можна разглядаць у рамках канкурэнцыі ў беларускай мове аднолькава „няўласнабеларускіх“ польскай і расійскай традыцый перадачы адпаведных груп лексікі.

падаваліся расійскія словы, адаптаваныя ў выпадку патрэбы да беларускага правапісу. Па меры зменаў у грамадска-палітычным жыцці і аднаўлення моваznаўчых кадраў у 1960-я і наступныя гады многія негатыўныя наступствы бытавання беларускай мовы ў папярэднія дзесяцігоддзі, звязаныя з яе бескантрольнай русіфікацыяй, былі ліквідаваны. У канцы 1980–1990-я гг. беларуская мова яшчэ больш актыўна пазбаўлялася многіх русізмаў. У цяперашні час можна гаварыць аб наступных з'явах, якія характарызуюць уплыў расійскай мовы на беларускую.

4.1. Арфаэпія, правапіс. У сферы кадыфікацыі вымаўлення расійскі ўплыў адсутнічае, аднак у сферы ўжывання адхіленні ад нормы вельмі частыя. Напрыклад, адсутнасць асіміляцыі свісцячых паводле мяккасці – вымаўленне [сн'эх] замест [с'н'эх], [зв'эр] замест [з'в'эр] і г. д. Да 1933 г. гэта з'ява пазначалася на пісьме, нарматыўным было напісанне *сьнег, зьвер* і пад. З канца 1980-х у межах руху за аднаўленне дарэформавай арфаграфіі (г. зв. „тарашкевіцы") пытанне пазначэння асіміляцыйнага змякчэння свісцячых на пісьме ў грамадскай свядомасці набыло гіпертрафіраванае значэнне і стала ўспрымацца ледзь не як галоўная рыса русіфікацыі беларускай мовы. Папраўдзе ж, павышаная ўвага да гэтай з'явы была абумоўлена перадусім агульным заняпадам беларускай мовы ў канцы 80-х і дэградацыяй вымаўленчай культуры, у прыватнасці, а таксама моцным сімвалічным значэннем пісьмовых знакаў.

У цэлым расійскі ўплыў у правапісе і вымаўленні на беларускую мову трэба прызнаць нязначным.

4.2. Марфалогія. Акрамя названых вышэй пунктаў можна дадаць наступныя:

а) Скасаванне ў 1957 г. формаў на *-эм* (*-ем*) абвеснага ладу цяперашняга часу дзеясловаў у 1-й асобе множнага ліку: напісанне *бяром, нясём* замест *бярэм, нясем*.[20]
б) Ужыванне некаторых запазычаных з расійскай мовы без марфалагічнай адаптацыі субстантываваных прыметнікаў тыпу *сталовая, ванная, гасціная*, якія ў беларускай мове патрабавалі б ужывання ў форме мужчынскага роду: *сталовы, ванны, гасціны* (*пакой*).

4.3. Словаўтварэнне.
а) Ужыванне дзеепрыметнікаў з суфіксамі *-ач- (-яч-), -уч- (-юч), -ем-, -ўш-*: *рашаючы, разглядаемы, пацямнеўшы*. (У цяперашні час вядзецца інтэнсіўная і даволі паспяховая барацьба з такімі формамі.)
б) Як вынік непасрэднага расійскага ўплыву ўспрымаюцца многія запазычаныя дзеясловы з фармантам *-ір-* (*-ыр-*): *эмігрыраваць, функцыяніраваць, нарміраваць*. „Уласна беларускімі" кваліфікуюцца формы без гэтага суфікса.

---

[20] Канчаткі *-ом* (*-ём*) уласцівы беларускім гаворкам гэтаксама, як і формы на *-эм* (*-ем*). На русіфікацыю тут паказвае тое, што для кадыфікацыі ў беларускай мове выбраны такія формы, якія супадаюць з расійскімі, што асабліва заўважаецца ў святле ранейшай практыкі. Тое ж самае справядліва і для разгледжаных вышэй выпадкаў са скасаваннем формаў *-ом* (*-ём*), *-ох* (*-ёх*) давальнага і меснага склонаў назоўнікаў і формаў загаднага ладу дзеясловаў 2-й асобы множнага ліку з канчаткамі *-эце, -еце*.

в) Некаторыя назоўнікі з суфіксам *-цель* тыпу *мысліцель, выхавацель*. Апошнім часам яны ўсё часцей замяняюцца словамі без гэтага фарманта, параўн.: *мысляр* або *думаннік*.
г) Вынікам расійскага ўплыву з'яўляецца больш грувасткая ў цэлым словаўтваральная структура многіх слоў. Параўн. *наведвальнік* пры паралельным існаванні формы *наведнік*, у апошнім на адрозненне ад першага не адчуваецца ніякога водгуку расійскага *посетитель*.

4.4. Фразеалогія. У гэтай сферы, як і ў папярэдняй, уплыў даволі значны. У беларускім маўленні нярэдка можна сустрэць выразы тыпу *два боты пара, ударыць у гразь тварам, глядзець у абодва, І смех, і слёзы, і каханне..., Лепш за горы могуць быць толькі горы, Вогнішчы рабіны чырвонай, На залатым ганку сядзелі* і пад., якія ўяўляюць сабой дакладныя паслоўныя пераклады адпаведных устойлівых расійскіх выразаў або цытат.

4.5. Лексіка. Уплыў на гэтым узроўні ці не найбольшы (*атрад, савет, халадзільнік, саіскальнік, састаўны* і інш.). Як і ў некаторых іншых выпадках русізмы на лексічным узроўні нярэдка ідэнтыфікуюцца таму, што яны маюць альтэрнатывы, запазычанні з польскай мовы: *кафэ – кавярня, іменна – менавіта, карандаш – аловак, рэзультат – вынік* і пад.

Вынікам расійскага ўплыву з'яўляецца наяўнасць вельмі пашыранага ў Беларусі ў неафіцыйным маўленні (але нярэдка і ў афіцыйным таксама) змешанага беларуска-расійскага або расійска-беларускага коду, які мае неафіцыйную назву „трасянка". Апошнім часам гэтая з'ява пачынае даследавацца беларускімі мовазнаўцамі (Цыхун 2000).

5. Становішча беларускай мовы ў яе кантактах з расійскай у XIX–XX стст. амаль заўсёды было падпарадкаваным. Нягледзячы на тое, што ў сярэднія вякі гэтыя мовы фарміраваліся аўтаномна, у XIX ст. беларуская мова стала разглядацца як неад'емная частка расійскай мовы, як г. зв. „адколатая мова" („мова, якая адкалолася").[21] Гэты адкол цалкам завяршыўся ў 1920-я гг. пры Савецкім Саюзе, і дадзеная акалічнасць дала падставу некаторым расійскім патрыётам сцвярджаць аб „незаконным" стварэнні беларускай мовы.[22]

1930–1980-я гг. паставілі беларускую мову на мяжу знікнення. У 60–70-я гг. мінулага стагоддзя падчас масавай урбанізацыі Беларусі беларуская мова, падобна, перайшла з шэрагу мажарытарных у разрад мінарытарных. У пачатку 90-х гг.

---

[21] Тэрміналогія запазычана ў Р. Марці, параўн.: *Abspaltung-Typ, abspaltenden Standardsprache* (Marti 2000, 532).

[22] Напрыклад, у 1929 г. эмігрант П. Біцылі пісаў наступнае: „В настоящее время мы присутствуем при весьма курьезном – но и зловещем – процессе искусственной выделки ‚языков' из диалектов русского языка. Ясно, что там, где у данной диалектологической группы нет литературы, – а ее у нее нет никогда [...], приходится выдумывать такие черты, которые бы служили основанием для отторжения данного ‚диалекта' от его ‚языка'. Таким вымышленным признаком является, например, фонетика ‚белорусского языка'. ‚Создатели' этого последнего ‚закрепляют' эту фонетику, долженствующую служить, в их представлении, ‚титулом' на право белорусского языка быть повышенным из ‚диалектов' в ‚языки' путем правописания" (Бицилли 1996, 83–84).

была здзейснена адчайная спроба зрабіць яе нармальным сродкам камунікацыі і адзінай дзяржаўнай мовай у Беларусі, аднак яна правалілася. Будучыня беларускай мовы (у тым ліку самая найбліжэйшая) вельмі няпэўная. Пры любым прагнозе наконт яе лёсу карысна мець на ўвазе наступныя акалічнасці.

5.1. Беларуская і расійская мова блізкароднасныя і ў значнай меры ўзаемазразумелыя. Наступствам гэтай узаемазразумеласці з'яўляецца асаблівы і вельмі пашыраны ў Беларусі тып камунікацыі, пры якім кожны з суразмоўцаў карыстаецца сваёй мовай: адзін – беларускай, другі – расійскай.[23] Не вельмі зразумела, якія сродкі ўздзеяння могуць выкарыстоўвацца для таго, каб носьбіты „вялікага" ідыёма (у нашым выпадку расійскай мовы) не абмяжоўваліся пасіўным разуменнем беларускага маўлення, але і былі гатовы карыстацца беларускай мовай.

5.2. Беларуская мова займае ў сучасным беларускім грамадстве вельмі двухсэнсавае становішча. З аднага боку, яна з'яўляецца „галоўнай", „тытульнай" мовай Беларусі, адной з прызнаных славянскіх моў. З другога боку, яна ўсё яшчэ стыгматызаваная як „адсталая вясковая мова" (back country language) (Basch 1998, 235), мова, падлеглая пагрозе знікнення (Rzetelska-Feleszko 1997, Levy 1999, Gutschmidt 2000). З аднаго боку, 74 % насельніцтва Беларусі прызнаюць беларускую мову ў якасці сваёй „роднай" (Национальный состав 2001, 199), з другога, на ёй у штодзённым жыцці кантактуюць ад 11 % (Levy 1999, 79) да 37 % (Национальный состав 2001, 303) насельніцтва краіны. З'яўляецца беларуская мова мовай большасці насельніцтва ці мовай яго меншасці? Калі беларуская мова з'яўляецца мовай большасці, то палітыку 1920-х і пачатку 1990-х гг., скіраваную на тое, каб яна стала галоўным сродкам камунікацыі ў Беларусі, верагодна, варта лічыць абгрунтаванай. Але як трэба ставіцца да такой палітыкі, калі беларуская мова з'яўляецца мовай меншасці?[24]

Яшчэ больш пытанняў можа паўставаць, калі праецыраваць сучасны (мінарытарны?) стан беларускай мовы на будучыню. Тут магчымы, падобна, 2 асноўныя варыянты.

---

[23] Беларускія аўтары называюць гэтую з'яву „двухмоўнай камунікацыяй" (параўн.: Мечковская 1994). У заходняй традыцыі падобная практыка называецца звычайна „напаўкамунікацыяй" (semicommunication).

[24] Пытанне мінарытарнага статусу беларускай мовы вельмі складанае і, баюся, адназначнага адказу не мае. На навуковым узроўні ў Беларусі яно амаль не абмяркоўваецца. Аднак рэальны стан беларускай мовы рана ці позна выкліча такое абмеркаванне, і яно памалу разгортваецца за межамі Беларусі, параўн., напрыклад: Rzetelska-Feleszko 1997. У. Алпатаў прымервае для беларускай мовы ірландскі варыянт развіцця (Алпатов 2000, 193–196). Аднак усё больш падстаў разглядаць такі ракурс даюць і ўнутраныя падзеі і публікацыі ў Рэспубліцы Беларусь. У траўні 1996 г. Таварыства беларускай мовы правяло канферэнцыю пад назвай „Дыскрымінацыя беларускай мовы ў Беларусі" (параўн. таксама: Bieder 1996). Але ці магчыма дыскрымінаваць мову большасці? Ці не з'яўляецца ў такім выпадку беларуская мова ў дадатак да фламандскай (гл.: Nelde 1991, 62) другой у Еўропе „мовай рэпрэсаванай большасці"? (Пытанне аб падабенстве беларускай сітуацыі да бельгійскай ужо цікавіла іншых аўтараў, параўн.: Marti 1998, 360, зноска 25.) Складанасць кваліфікацыі беларускай сітуацыі змусіла аднаго вельмі праніклівага назіральніка залічыць да мінарытарных у Беларусі ўсе мовы, што ўжываюцца ў ёй (Gustavsson 1995, 52).

а) Беларуская мова належыць да разраду моў „класічных“ меншасцяў тыпу валійскай, галісійскай, фрызскай, брэтонскай, кашубскай і пад. У такім выпадку на яе павінна пашырацца адкрыта пратэкцыянісцкая палітыка, скіраваная на яе падтрымку ў адносінах з больш моцнай расійскай. Такая палітыка паспрыяе (спрыяла б) пэўнаму захаванню беларускай мовы, яе кансервацыі. Лёс яе як мовы меншасці ў будучыні будзе залежаць ад працягласці і мэтанакіраванасці пратэкцыянісцкіх захадаў, а таксама іншых чыннікаў, аднак пры такім падыходзе можна напэўна сцвярджаць, што беларуская мова ўжо ніколі не будзе прэтэндаваць на тое, каб зрабіцца ў Беларусі мовай большасці.[25]

б) Беларуская мова належыць да разраду моў меншасцяў, яна, аднак, імкнецца вярнуць свой нядаўні статус большасці. Якія захады пры гэтым могуць ці павінны выкарыстоўвацца? Несумненна, і пры гэтым варыянце будзе прадугледжвацца актыўная пазітыўная дыскрымінацыя беларускай мовы, але як гэта будзе стасавацца з дэмакратычнымі правіламі жыцця ў сучасным грамадстве[26] і ў якой меры падобная практыка можа і будзе падтрымлівацца насельніцтвам?[27]

---

[25] Такі сцэнарый прапанаваў нядаўна для беларускай мовы (кваліфікуючы яго як выратавальны) адзін з найстарэйшых актывістаў Таварыства беларускай мовы, доктар філалагічных навук Л. Лыч (Лыч 2002а, Лыч 2002б). Асаблівы каларыт дадзеным публікацыям Л. Лыча надае тое, што дагэтуль ён надрукаваў вялікую колькасць артыкулаў, у якіх зыходзіў з таго, што беларускамоўныя з’яўляюцца ў Беларусі (ці, прынамсі, павінны быць) большасцю.

[26] Н. Мячкоўская лічыць, што безумоўнай прадпасылкай адраджэння беларускай мовы з’яўляецца дэмакратыя (Мячкоўская 2001, 180). Але варта прызнаць, што дэмакратычныя інстытуты ў сучаснай Беларусі развіты даволі або і нават выключна слаба, і цяжка чакаць значнага прагрэсу ў блізкай будучыні. З другога боку, нам давялося коратка паказаць, што ў 1992–1995 гг. беларускія дэмакраты, якія ў моўнай сферы апелявалі да ўзораў „савецкай дэмакратыі“ канца 1950-х, садзейнічалі звядзенню беларускай мовы да ўзроўню маргінальнай і дыскрымінацыі яе носьбітаў (Запрудскі 2002; Запрудський 2003. Багаты матэрыял, які характарызуе сучасную сітуацыю носьбітаў беларускай мовы ў Беларусі, гл. у: Майсеня 2000). Якой акажацца роля дэмакратыі ў доўгатэрміновым лёсе беларускай мовы? Параўн. таксама меркаванне, згодна з якім у посткамуністычных краінах пераход да дэмакратыі немагчымы, калі ў іх не завяршыліся нацыянальныя рэвалюцыі (Roeder 1999).

[27] Нярэдка лічыцца, што няўдачу моўнай рэформы пачатку 1990-х у Беларусі трэба тлумачыць выключна тым, што яна не была падтрымана насельніцтвам. Між тым, А. Зам заўважае, што ў 1990–1991 гг. гэтая падтрымка была даволі высокай і толькі пазней зменшылася (Sahm 2001, 184). Д. Марплс спасылаецца на дадзеныя апытання грамадскай думкі 1992 г. і паказвае, што ў гэты час падтрымка насельніцтвам дзяржаўнага статусу беларускай мовы была ўжо невысокай (Marples 1996, 37, Marples 1999, 574). Асобнай размовы заслугоўвала б праблема аб’ектыўнасці рознага кшталту апытанняў. З аднаго боку, рабочай мовай пераважнай большасці беларускіх сацыёлагаў з’яўляецца расійская. З другога, некаторыя апытанні, дадзеныя якіх друкаваліся ў папулярным друку і выкарыстоўваліся ў палітычных дэбатах (як, напрыклад, матэрыялы апытання 1992 г. Сацыялагічнага цэнтра Беларускага дзяржаўнага універсітэта), былі выкананы на замову і пры фінансавай падтрымцы кіраўніка фірмы „Эридан“ А. Патупы, які ў першай палове 1990-х актыўна выказваўся супраць садзеяння беларускай мове.

5.3. Праекты адраджэння беларускай мовы 1980-х гг. абапіраліся перадусім на маральныя і эстэтычныя абгрунтаванні, параўн., напрыклад: Бембель 1985, Пазьняк 1992. На маральныя заклікі ў значнай меры абапіраюцца і ўсе сучасныя прыхільнікі датрымання правоў чалавека, умацавання экалогіі, моўнай разнастайнасці і г. д. (Цыхун 1998). Ці экалагічная свядомасць мае нейкія шанцы на тое, каб зрабіцца значнай сілай сучаснага грамадства? Ці маральныя прынцыпы з'яўляюцца колькі-небудзь дзейсным інструментам у сітуацыі сучаснай эканамічнай трансфармацыі ў краінах Цэнтральнай і Усходняй Еўропы?

5.4. Літаральна ў самы апошні час Беларусь і беларуская мова непасрэдна сутыкнуліся з выклікам глабалізацыі. Глабалізацыя сярод іншага нагадала, што беларуская мова з'яўляецца ўсяго толькі *адной* з некалькіх тысяч моў свету[28], што колькасць моў свету імкліва скарачаецца, што унікальны характар беларускай мовы не гарантуе пільнай міжнароднай увагі да праблемы яе выжывання. Беларусь яшчэ амаль нічога не зрабіла, каб будаваць далейшую палітыку з улікам гэтай новай рэальнасці.

5.5. Гісторыя апошніх 15 гадоў паказала, што на лёс беларускай мовы ў гэты час моцна ўплывалі палітычныя чыннікі. З аднаго боку, іх можна кваліфікаваць як самыя эфектыўныя рычагі ў правядзенні любой моўнай палітыкі. З другога, палітызацыя моўных пытанняў нярэдка выклікае моцны супраціў ў пэўных сегментах грамадства і тым самым перашкаджае рэалізацыі моўных рэформаў. У пэўным сэнсе можна гаварыць, што ў апошнія 15 гадоў беларуская мова была закладніцай зменаў палітычнага курсу ў Беларусі. Спачатку, у канцы 1980 / пачатку 1990-х, палітычная кан'юнктура спрыяла ўздыму беларускай мовы, пазней, у другой палове 1990-х, яна з няменшым поспехам садзейнічала яе заняпаду. Ці існуюць якія-небудзь, эфектыўныя ў плане правядзення моўнай палітыкі, сродкі, каб разарваць заганную сувязь лёсу беларускай мовы з канкрэтнымі палітычнымі сіламі?

5.6. Нават пры самым спрыяльным сцэнарыі развіцця падзей для беларускай мовы і адначасова неспрыяльным для расійскай мовы ў іх узаемных кантактах беларуская мова будзе непазбежна кваліфікавацца як „малая" і „слабая", а расійская як „вялікая" і „моцная". Такая сітуацыя ўтрымлівае моцны канфліктны патэнцыял, і, калі пры гэтым не будуць прымацца ніякія спецыяльныя захады, то з цягам часу наяўная нераўнавага непазбежна зрушыцца на карысць мацнейшай мовы (Marti 1998, 354–356). Магчымыя тры спосабы развязання падобных сітуацый: а) будзе рэалізоўвацца умацавальная моўная палітыка (скіраваная на садзеянне мацнейшай мове), б) будзе рэалізоўвацца перасцерагальная (bewahrende) моўная палітыка (калі ёсць імкненне захаваць status quo), в) будзе рэалізоўвацца кампенсацыйная моўная палітыка (пры якой наяўная нераўнавага здымаецца ці, прынамсі, змяншаецца). Сучасная беларуская сітуацыя дэманструе даволі незвычайны выпадак, калі пераважаюць два першыя падыходы (Marti 1998, 355, 361). Калі будучы лёс беларускай мовы няпэўны, то расійская – нягледзячы на катаклізмы апошніх гадоў і

[28] У „Этнолаг" Б.-Ф. Граймс (Grimes 2000) уключаны звесткі пра больш, чым 6800 моў і дыялектаў.

наяўнасць некаторых скрушлівых прагнозаў – тым не менш «асуджана на „новае жыццё“ (Mokienko 1999, 83). Гэтае фундаментальнае адрозненне, несумненна, варта прымаць пад увагу.

Цягам двух апошніх стагоддзяў за невялікімі выняткамі ў Беларусі рэалізоўвалася моўная палітыка, якая мела на мэце сцвярджэнне ў грамадстве адной, расійскай мовы. Нягледзячы на тое, што ў другой палове мінулага стагоддзя падобная практыка неадменна ўвасаблялася пад акампанемент размоў аб „гарманічным білінгвізме“, „раўнапраўным“ і „дэмакратычным“ падыходзе ў моўнай палітыцы, другая (расійская) мова ў Беларусі заўсёды засвойвалася з чаканнем таго, што ўрэшце яна заменіць беларускую. У заходняй сацыялінгвістыцы для пазначэння такога роду дзейнасці існуе панятак „аднімальнага білінгвізму“ (subtractive bilingualism) (Corson 1992, 52). У выніку за гэты час адбылося выразнае пераразмеркаванне ва ўжыванні ў Беларусі розных моў, і ў сукупнасці рознамоўнага ўжывання стала менш. Альтэрнатывай аднімальнаму білінгвізму магло б быць дадавальнае двухмоўе (additive bilingualism), пры ім другая мова засвойваецца зыходзячы з чакання, што першая, родная мова будзе выкарыстоўвацца і далей. Пры сучасным стане развіцця беларускага грамадства аднімальны білінгвізм выглядае як пэўнага тыпу вычварэнне.[29] Культываванне дадавальнага білінгвізму ў Беларусі мае выключна слабую традыцыю. Дваццаць першае стагоддзе пакажа, ці зможа ён сцвердзіць сябе ў будучыні.

Літаратура

Алпатов 2000: В. М. Алпатов, *150 языков и политика. 1917–2000. Социолингвистические проблемы СССР и постсоветского пространства*, Москва: Крафт+, Институт востоковедения.

Андрэева 1989: Ефрасіння Андрэева, „Беларусізацыя 20-х гадоў і школа“, у: *Беларуская мова і літаратура ў школе* 7, 4–8.

Бембель 1985: Алег Бембель, *Роднае слова і маральна-эстэтычны прагрэс*, Лёндан: The Association of Byelorussians in Great Britain.

Бессонов 1871: Пётр Бессонов, *Белорусские песни*, Москва: Общество любителей российской словесности.

Биржакова, Войнова, Кутина 1972: Е. Э. Биржакова, Л. А. Войнова, Л. Л. Кутина, *Очерки по исторической лексикологии русского языка XVIII века. Языковые контакты и заимствования*, Ленинград: Наука.

Бицилли 1996: П. М. Бицилли, „Нация и Язык“, у: П. М. Бицилли, *Избранные труды по филологии*, [Без месца]: Российская Академия наук, Отделение литературы и языка, 79–97.

[29] Падчас бурных дыскусій пачатку 90-х тагачасны дэкан філалагічнага факультэта Беларускага дзяржаўнага універсітэта, доктар філалагічных навук А. Лойка даў інтэрв'ю, якое было апублікавана пад назвай „Білінгвізм – антынародная тэорыя“ (перадрук гл. у: Лойка 2001). Не даводзіцца сумнявацца, што гэты інтэлігент, паэт, перакладчык з некалькіх моў, не выступаў супраць двухмоўя як такога. Яго пратэст быў скіраваны менавіта супраць аднімальнага білінгвізму, які „абкрадвае“ беларускае грамадства.

Булич 1904: С. К. Булич, *Очерк истории языкознания в России. Т. 1. (XIII в.–1825 г.)*, С.-Петербург: Типография М. Меркушева.

Войніч 1990: І. Войніч, „Да гісторыі моўнай сітуацыі ў выдавецкай справе БССР“, у: *Тэзісы дакладаў на І Заслаўскіх чытаннях Беларускага навукова-гуманітарнага таварыства (13–14 траўня 1989 г.)*, Менск: СП „Бел-прэс-ІНФА“, 43–45.

Запруднік 2001: Янка Запруднік, „Беларускае (дваццатае) стагоддзе: Параўнальная рэтраспектыва“, у: Э. Дубянецкі, Г. Дзербіна, Л. Лыч (рэд.), *Нацыянальныя пытанні. Матэрыялы ІІІ Міжнароднага кангрэса беларусістаў „Беларуская культура ў дыялогу цывілізацый“*, Мінск: Беларускі кнігазбор, 120–126.

Запрудскі 2002: Сяргей Запрудскі, „Моўная палітыка ў Беларусі ў 1990-я гады“, у: *Arche-Пачатак* 1, 98–112.

Запрудський 2003: Сергій Запрудський, „Мовна політика в Республіці Білорусь у 1990-і роки“, у: *Розбудова держави* 1 (у друку).

Каўко 1987: А. К. Каўко, „Адносіны да роднай мовы як этычная праблема (паводле публіцыстыкі Я. Коласа)“, у: З. М. Камароўская і інш. (рэд.), *Каласавіны. Тэзісы дакладаў і паведамленняў навуковай канферэнцыі*, Мінск: Акадэмія навук БССР, 19–22.

Кнорин 1990: В. Г. Кнорин, *Избранные статьи и речи*, Минск: Беларусь.

Коряков 2002: Ю. Б. Коряков, „Языковая ситуация в Белоруссии“, у: *Вопросы языкознания* 2, 109–127.

Лёсік 1925: Я. Лёсік, „Неўстаноўленыя выпадкі нашага правапісу“, у: *Полымя* 2, 129–148.

Лойка 2001: Алег Лойка, „Білінгвізм – антынародная тэорыя“, у: Алег Лойка, *Галгофа. Кніга лёсаў*, Слонім: ГАУПП „Слонімская друкарня“, 105–109.

Лукашанец 1994: А. А. Лукашанец, „Двухмоўе“, у: А. Я. Міхневіч (рэд.), *Беларуская мова. Энцыклапедыя*, Мінск: Беларуская энцыклапедыя імя Петруся Броўкі, 174–176.

Лыч 2002а: Леанід Лыч, „Ратуйма беларускамоўную меншыню!“, у: *Літаратура і мастацтва* 18 студзеня, 5.

Лыч 2002б: Леанід Лыч, „Ратуйма беларускамоўную меншыню!“, *Наша слова* 28 жніўня, 2–3.

Майсеня 2000: Л. Майсеня і інш. (рэд.), *Аняменне: з хронікі знішчэння беларускай мовы*, Вільня: Gudas.

Мечковская 1994: Нина Борисовна Мечковская, „Языковая ситуация в Беларуси: этические коллизии двуязычия“, у: *Russian Linguistics* 18, 299–322.

Мечковская 1998: Нина Мечковская, „Зачем одному народу две азбуки? (Кириллица и латинка в коллизиях белорусского возрождения)“, у: *Slavia Orientalis* XLVII, 277–292.

Мячкоўская 2001: Ніна Мячкоўская, „Сацыялінгвістычны погляд на чыннікі, тармазы і прыярытэты нацыянальнага адраджэння“, у: Г. Цыхун, С. Запрудскі, Н. Мячкоўская (рэд.), *Беларуская мова. Шляхі развіцця, кантакты, перспектывы. Матэрыялы ІІІ Міжнароднага кангрэса беларусістаў „Беларуская культура ў дыялогу цывілізацый“*, Мінск: Беларускі кнігазбор, 173–180.

Навіцкі 1993: У. Навіцкі, „Асаблівасці культурнага жыцця на Беларусі ў першае пасляваеннае дзесяцігоддзе“, у: *Беларускі гістарычны часопіс* 1, 96–102.

Национальный состав 2001: *Национальный состав населения Республики Беларусь и распространенность языков: Итоги переписи населения Республики*

Беларусь 1999 года. Статистический сборник. Том I. Минск: Министерство статистики и анализа Республики Беларусь.

Нещименко 1998: Г. П. Нещименко, «Значимость оппозиции „носитель – пользователь“ языка (языкового идиома) для изучения специфики языковой ситуации и ее динамики», у: О. Н. Трубачев (рэд.), *Славянское языкознание. XII Международный съезд славистов. Краков, 1998 г. Доклады российской делегации*, Москва: Наука, 460–474.

Падлужны 1997: А. І. Падлужны, *Мова і грамадства*, Мінск: Беларускі кнігазбор.

Пазьняк 1992: Зянон Пазьняк, „Двуязычие и бюрократизм“, у: Зянон Пазьняк, *Сапраўднае аблічча*, Менск: ТВЦ „Паліфакт“, 39–52.

Перавалава 1998: Наталля Перавалава, „‚Его можно назвать отцом великороссийского наречия ...‘ Дзмітрый Языкаў як даследчык беларускай мовы“, у: *Роднае слова* 6, 90–93.

Прыгодзіч 1994: Мікалай Прыгодзіч, „‚В нём скрываются драгоценные остатки древнего языка славянского ...‘ Канстанцін Калайдовіч як першы даследчык беларускай мовы“, у: *Роднае слова* 12, 21–25.

Радзік 2001: Рышард Радзік, „Пецярбургскі ‚Гоман‘ як пачынальнік беларускай нацыянальнай ідэі ў XIX ст.“, у: Э. Дубянецкі, Г. Дзербіна, Л. Лыч (рэд.), *Нацыянальныя пытанні. Матэрыялы III Міжнароднага кангрэса беларусістаў „Беларуская культура ў дыялогу цывілізацый“*, Мінск: Беларускі кнігазбор, 76–87.

Рудовіч 2001: Станіслаў Рудовіч, „Пашырэнне сацыяльных функцый беларускай мовы ў абставінах першай сусветнай вайны: гістарычны вопыт, урокі для нашчадкаў“, у: Г. Цыхун, С. Запрудскі, Н. Мячкоўская (рэд.), *Беларуская мова. Шляхі развіцця, кантакты, перспектывы. Матэрыялы III Міжнароднага кангрэса беларусістаў „Беларуская культура ў дыялогу цывілізацый“*, Мінск: Беларускі кнігазбор, 6–10.

Снапкоўская 1998: С. В. Снапкоўская, *Адукацыйная палітыка і школа на Беларусі ў канцы XIX – пачатку XX стст.*, Мінск: Нацыянальны інстытут адукацыі.

Станкевіч 2002: Ян Станкевіч, „Змена граматыкі беларускага языка ў БСРР“, у: Ян Станкевіч, *Збор твораў у двух тамах. Том 1*, Менск: Энцыклапедыкс, 327–343.

Судник 1990: М. Р. Судник, „Белорусский язык“, у: В. Н. Ярцева (рэд.), *Лингвистический энциклопедический словарь*, Москва: Советская энциклопедия, 71–72.

Сямешка 1998: Лідзія І. Сямешка, „Сацыялінгвістычныя аспекты функцыянавання беларускай літаратурнай мовы ў другой палове XX ст.“, у: A. Lukašanec, M. Prigodzič, L. Sjameška (рэд.), *Беларуская мова*, Opole: Uniwersytet Opolski – Instytut Filologii Polskiej, 25–54.

Трубачев 1995: О. Н. Трубачев, „Русский – российский. История, динамика, идеология двух атрибутов нации“, у: Е. Троицкий (укл.), *Русская нация: историческое прошлое и проблемы возрождения*, Москва: Ассоциация по комплексному изучению русской нации, 28–36.

Цыхун 1998: Генадзь Цыхун, *Славянскія мовы ў святле экалінгвістыкі*, Мінск: Нацыянальная акадэмія навук Беларусі.

Цыхун 2000: Генадзь Цыхун, „Крэалізаваны прадукт. Трасянка як аб’ект лінгвістычнага даследавання“, у: *Arche-Пачатак* 6, 51–58.

Шпилевский 1992: П. М. Шпилевский, *Путешествие по Полесью и Белорусскому краю*, Минск: Полымя.

Basch 1998: Raymond M. Basch, „The Effects of Ethnic Separation on Democratization: A Comparative Study“, у: *East European Quarterly* XXXII, 221–242.

Bieder 1995: Hermann Bieder, „Soziolinguistische Aspekte der weißrussischen Sprache“, у: *Zeitschrift für Slawistik* 40, 398–414.

Bieder 1996: Hermann Bieder, „Zur Diskriminierung der weissrussischen Sprache in der Republik Weissrussland“, у: *Die Slavischen Sprachen* 50, 67–122.

Bieder 2001: Hermann Bieder, „Der Kampf um die Sprache in 20. Jahrhundert“, у: D. Beyrau, R. Lindner (рэд.), *Handbuch der Geschichte Weißrußlands*, Göttingen: Vanderhoeck & Ruprecht, 451–471.

Corson 1992: David Corson, „Bilingual education policy and social justice“, у: *Journal of Education Policy* 7, 45–69.

Goujon 1999: Alexandra Goujon, „Language, nationalism, and populism in Belarus“, у: *Nationalities Papers* 27, 661–677.

Grimes 2000: Barbara F. Grimes (рэд.), *Ethnologue. Volume 1. Languages of the World*, Dallas: SIL International.

Gustavsson 1995: Sven Gustavsson, „Belarus: A Multilingual State in Eastern Europe“, у: S. Gustavsson, H. Runblom (рэд.), *Language, Minority, Migration. Yearbook 1994/1995 from the Centre for Multiethnic Research*, Uppsala: Centre for Multiethnic Research – Uppsala University, 39–74.

Gutschmidt 2000: Karl Gutschmidt, „Sprachenpolitik und sprachliche Situation in Weißrußland seit 1989“, у: Baldur Panzer (рэд.), *Die sprachliche Situation in der Slavia zehn Jahre nach der Wende. Beiträge zum Internationalen Symposion des Slavischen Instituts der Universität Heidelberg vom 29. September bis 2. Oktober 1999*, Frankfurt am Main etc.: Peter Lang, 67–84.

Haarmann 1998: Harald Haarmann, „On the Role of Russian in the Post-Soviet Era: Aspects of an Orderly Chaos“, у: *Plurilinguismo* 5, 75–88.

Hentschel 1997: Gerd Hentschel, „Rußland, Weißrußland, Ukraine: Sprachen und Staaten der ‚slavischen Nachfolge‘ von Zarenreich und Sowjetunion“, у: Gerd Hentschel (рэд.), *Über Muttersprachen und Vaterländer. Zur Entwicklung von Standardsprachen und Nationen in Europa,* Frankfurt am Main etc.: Peter Lang, 212–240.

Levy 1999: Patricia Levy, *Belarus*, New York, London, Sydney: Marshall Cavendish.

Marples 1996: David R. Marples, *Belarus From Soviet Rule to Nuclear Catastrophe*, Edmonton: The University of Alberta Press.

Marples 1999: David R. Marples, „National awakening and national consciousness in Belarus“, у: *Nationalities Papers* 27, 565–578.

Marti 1998: Roland Marti, „Sprachenpolitik im slavischsprachigen Raum. Das Verhältnis ‚großer‘ und ‚kleiner‘ slavischer Standardsprachen“, у: *Zeitschrift für Slavische Philologie* 57, 353–370.

Marti 2000: Roland Marti, „Slavische Standardsprachen im Kontakt. Das Neben-, Mit- und Gegeneinander slavischer Standardsprachen“, у: L. N. Zybatow (рэд.), *Sprachwandel in der Slavia. Die slavischen Sprachen an der Schwelle zum 21. Jahrhundert,* Frankfurt am Main etc.: Peter Lang, 527–543.

Mayo 1977: P. J. Mayo, „The Alphabet and Orthography of Byelorussian in the 20th Century“, у: *The Journal of Byelorussian Studies* 4, 28–48.

McMillin 1967: Arnold B. McMillin, „Academician Ja. F. Karski (1861–1931)“, у: *The Journal of Byelorussian Studies* 1, 207–214.

Mokienko 1999: V. M. Mokienko, The Russian Language „On the Brink“: The Linguistic Situation in Present-day Russia», у: J. A. Dunn (рэд.), *Language and Society in Post-Communist Europe. Selected Papers from the Fifth World Congress of Central and East European Studies, Warsaw, 1995*, Basingstoke etc.: MacMillan, 70–85.

Nelde 1991: P. N. Nelde, „Language conflicts and prospects for 1993“, у: F. Coulmas (рэд.), *A Language Policy for the European Community. Prospects and Quandaries*, Mouton de Gruyter, 59–73.

Plotnikau 2000: Branislau A. Plotnikau, „Äussere Ursachen für die begrenzte Verwendung der Weissrussischen Sprache“, у: *Die Welt der Slaven* 45, 49–58.

Radzik 2000: Ryszard Radzik, Między zbiorowoscią etniczną a wspólnotą narodową. Białorusini na tle przemian narodowych w Europie Środkowo-Wschodniej XIX stulecia, Lublin: Wydawnictwo Uniwersytetu Marii Curie-Skłodowskiej.

Rieber 1994: Alfred J. Rieber, „Russian Imperialism: Popular, Emblematic, Ambiguous“, у: *The Russian Review* 53, 331–335.

Roeder 1999: Philip G. Roeder, „Peoples and States after 1989: The Political Costs of Incomplete National Revolutions“, у: *Slavic Review* 58, 854–882.

Rzetelska-Feleszko 1997: Ewa Rzetelska-Feleszko, „Zagrożone języki słowiańskie: łużycki i białoruski“, у: *Lětopis* 44, 194–197.

Sahm 2001: Astrid Sahm, „Von der BSSR zur Republik Weißrußland – Belarus (1988–2001)“, у: D. Beyrau, R. Lindner (рэд.), *Handbuch der Geschichte Weißrußlands*, Göttingen: Vanderhoeck & Ruprecht, 178–196.

Wexler 1974: Paul N. Wexler, *Purism and Language: A Study in Modern Ukrainian and Belorussian Nationalism (1840–1967)*, Bloomington: Indiana University.

Wexler 1992: Paul Wexler, „*Diglossia et schizoglossia perpetua* – the fate of the Belorussian language“, у: Klaus J. Mattheier, Baldur Panzer (рэд.), Nationalsprachenentstehung in Osteuropa, Tübingen: Max Niemeyer (Sociolinguistica 6), 42–51.

Witkowski 1999: Wiesław Witkowski, *Słownik zapożyczeń polskich w języku rosyjskim*, Kraków: Universitas.

Woolhiser 1995: Curt Woolhiser, „The sociolinguistic study of language contact and bilingualism in the former Soviet Union: The case of Belarus“, у: J. Harlig, Cs. Plüh (рэд.), *When East Met West. Sociolinguistics in the Former Socialist Bloc*, Berlin, New York: Mouton de Gruyter, 63–88.

Woolhiser 2001: Curt F. Woolhiser, „Language Ideology and Language Conflict in Post-Soviet Belarus“, у: Camille C. O'Reilly (рэд.), *Language, Ethnicity and the State. Vol. 2: Minority Languages in Eastern Europe post-1989.* New York: Palgrave, 91–122.

Zoltán 1998: András Zoltán, „Почему русские *одерживают* победы?“, у: *Russian linguistics* 22, 165–177.

The Belarusian Language in Contact with Russian: In the Grip of Subtractive Bilingualism

Summary

The paper deals with the history and the present state of the relationship between Belarusian and Russian. Language policies applied since the second half of the nineteenth century – favouring Belarusian or directed against it – are described. The Russian influence upon Belarusian at different levels is outlined. Special attention is paid to the Belarusian language reform of 1933. Possible future developments of the Belarusian language are discussed. The author arrives at the conclusion that language policy in Belarus as applied since the second half of the nineteenth century promoted a situation of subtractive bilingualism.